Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 39 (470) | Нядзеля, 31 снежня 1961 г. | Цана 1 кап.

## Да новых поспехаў

1961 год! Якім памятным і знамянальным быў ён для савецкага народа! У гэтым годзе наша краіна няспынна ішла па шляху ўсё новых выдатных перамог як у галіне народнай гаспадаркі, так і ў вобласці навукі, культуры, тэхнікі, мастацтва. 1961 год быў годам працоўных перамог.

1961 год — год-піянер. Гэтая лічба ў памяці людзей застанецца назаўсёды. У 1961 годзе ўпершыню было адчынена вакно ў Сусвет. 12 красавіка 1961 года Першы савецкі касманаўт Юрый Гагарын абляцеў Зямлю на касмічным караблі «Усход». Праз некаторы час маёр Герман Цітоў паўтарыў подзвіг Гагарына.

І яшчэ адна выдатная падзея адбылася ў 1961 годзе. Нашых рабочых і служачых, дзеячоў навукі, культуры і мастацтва, калгаснікаў будуць заўсёды хваляваць велічныя ідэі і рашэнні XXII з'езда КПСС. Незабываемыя радкі новай Праграмы КПСС, якая была прынята на з'ездзе, ярка паказалі тую запаветную мару, за якую змагаецца савецкі народ. Гэта мара —камунізм!

Мы жывем у час, калі мары здзяйсняюцца, становяцца явай. Камунізм, светлую будучыню, наблізіў, зрабіў канкрэтнай, зразумелай і адчувальнай XXII з'езд партыі. Камунізм зацвярджае на зямлі МІР, ПРАЦУ, СВАБОДУ, РОЎНАСЦЬ, БРАТЭРСТВА І ШЧАСЦЕ ўсіх народаў.

Калектыў універсітэта таксама добра папрацаваў у 1961 годзе. Былі закончаны асноўныя работы па будаўніцтву і ўвядзенню ў строй новага корпуса. Былі адкрыты новыя кафедры і аўдыторыі. У 1961 годзе універсітэт выпусціў для патрэб народнай гаспадаркі 940 маладых высокакваліфікаваных спецыялістаў, вялікі атрад аспірантаў, навуковых работнікаў.

Для універсітэта 1961 год—юбілейны. Нядаўна БДУ імя Леніна споўнілася 40 год. Творчы ўзрост! Няхай жа і далей жыве універсітэт многія дзесяткі год, няхай нясе ўперад сцяг перадавой савецкай навукі!

Рэктарат, партыйны камітэт віншуюць студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкі састаў, аспірантаў і супрацоўнікаў універсітэта з наступаючым Новым годам і жадаюць усяму калектыву вялікіх поспехаў, здароўя ў Новым, 1962 годзе.

А. Н. СЕЎЧАНКА,
рэктар універсітэта.

## Добрым справам працяг будзе

Год заўжды крылатым гэты
Звацца будзе:
Нёс у космас ён ракеты,
Радасць — людзям.

Вёў да згоды ўсе народы,
Не марудзіў.
З новым шчасцем! З Новым годам!
Працяг будзе!

Зорнай высі, новых песняў
Прагнуць грудзі,
Вясна прыдзе за прадвеснем,
Працяг будзе!

Палымяных сэрцаў старасць
Не астудзіць,
Здзейснім светлыя мы мары,
Працяг будзе!

Навакол жыццё гамоніць:
Працяг будзе
Добрым справам, што сягоння
Робяць людзі!

П. СУШКО.



Малюнак Міхася Знака (І курс адлз. журналістыкі).

# Упэўнена ў Новы год мы крочым!

## Пленум камітэта камсамола

*У сярэдзіне снежня адбыўся пашыраны пленум камітэта камсамола, у рабоце якога прынялі ўдзел шырокі камсамольскі актыў універсітэта, а таксама члены партыйнага камітэта БДУ.*

*Было разгледжана пытанне «Аб вучэбных і палітыка-выхаваўчых задачах камсамольскай арганізацыі на бліжэйшы час».*

*Пленум прыняў пастанову, у якой адзначаны недахопы ў рабоце, а таксама ўказаны канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на ўздым камсамольскай і выхаваўчай работы ва універсітэце.*

*Пленум праходзіў пад знакам нядаўна адбыўшагася XXII з'езда КПСС.*

## Пачатак добры!

*Першы экзамен! Для першакурсніка ён асабліва адказны і хвалюючы. Не дзіва, што калі студэнты І курса аддзялення журналістыкі прышлі здаваць экзамен па вуснай народнай творчасці напярэдадні Новага года, то вельмі хваляваліся.*

*Але вось выходзіць адзін, другі, трэці. Таварышы па групе, як водзіцца ў такіх выпадках, пытаюць: «Ну як? Што? І калі ў адказ чуецца «выдатна», ці «добра», то кожны, хто чакае яшчэ сваёй чаргі, употай зайздросціць шчасліўцу і сам крыху супакойваецца.*

*Экзамен прымала дацэнт Вера Анісімаўна Захарава. Ведамі студэнтаў яна задаволена. Аб гэтым гавораць адзнакі. З 25 чалавек «выдатна» атрымалі 8, 11—«добра».*

А. МАКАРЭВІЧ.

## ПЛАНЫ І ЗАДУМЫ

1961 год для работы нашых калектываў мастацкай самадзейнасці не быў асабліва «ўраджайным». Але ўсё ж значныя поспехі мы маем. Хору універсітэта было прысвоена ганаровае званне — Народная харавая капэла.

Танцавальны калектыў БДУ ў гэтым годзе ўпершыню выступіў з самастойным канцэртам як ансамбль танца. Пачалі працаваць эстрадны аркестр і тэатральны калектыў. У апошні час некалькі палепшылася работа аркестра народных інструментаў.

У 1962 годзе ў Беларусі будзе праводзіцца рэспубліканская дэкада самадзейнага мастацтва. Мы павінны так арганізаваць работу, каб большасць нашых калектываў атрымалі права ўдзельнічаць у заключных канцэртах дэкады. А для гэтага неабходна добра і прадуктыўна папрацаваць.

Спадзяёмся таксама ў 1962 годзе арганізаваць выезды нашых калектываў з творчымі справаздачамі ў вузы як Беларусі, так і другіх рэспублік.

Г. ГЕРАСІМЕНКА.

## ВЕЧАР МАСТАЦКАГА СЛОВА

У гуманітарным корпусе універсітэта адбыўся вечар паэзіі, прысвечаны класіку беларускай літаратуры Максіму Багдановічу.

У правядзенні вечара прынялі ўдзел як выкладчыкі, так і студэнты, паэты універсітэта, мединстытута, аўтамабільнага завода. Нямала сабралася і аматараў літаратуры, прасторная актавая зала ледзь магла змясціць усіх прысутнічаючых.

З уступнай гутаркай аб савецкай паэзіі выступіла выкладчык універсітэта Н. Н. Багалюбава, свае вершы прачыталі паэты Ніл Гілевіч, Алег Лойка, студэнт універсітэта Іван Ласкоў, рабочы паэт Казімір Гляйхенгауз. З чытаннем мастацкіх твораў выступілі выпускнік універсітэта В. Бечык і І. Шаблоўская, студэнтка V курса.

У заключэнне артыст драматычнага тэатра М. Кудрашоў прачытаў паэму Р. Раждзественскага «Рэквіем».

Хацелася б пажадаць, каб такія вечары часцей праводзіліся, каб тэматыка іх больш дакладна прадумвалася. Жадаючыя наведаць вечары будуць, бо паэзіяй цікавяцца ўсе.

І. ПЯТРОЎ,
студэнт II курса філфака.

# Інтэрв'ю пад Новы год

**І. І. ТРУХАН, дэкан геаграфічнага факультэта:**



У 1961 годзе выкладчыкі факультэта падрыхтавалі падручнік па геаграфіі Беларускай ССР для універсітэтаў і педагагічных інстытутаў, а таксама рад брашур аб прыродзе, насельніцтву, гаспадарцы абласцей БССР, якія будуць з'яўляцца вельмі патрэбным і каштоўным дапаможнікам для настаўнікаў, бо ў праграмы сярэдніх школ уведзена вывучэнне роднага краю.

У 1962 годзе кафедра глебавядзення і геалогіі пад кіраўніцтвам акадэміка Івана Сцяпанавіча Лупіновіча пачне працу па глебава-біяхімічнаму раяніраванню тэрыторыі БССР, што будзе мець важнае значэнне для ўнясення ўгнаенняў у глебу, для павышэння урадлівасці зямель. Для выканання гэтай работы ствараецца спецыяльная глебавая лабараторыя.

Многія студэнты старэйшых курсаў нашага факультэта ў час вытворчай практыкі складалі глебавыя карты для калгасаў і саўгасаў некалькіх раёнаў Мінскай вобласці. Гэтыя карты перададзены для практычнага карыстання. У 1962 годзе работа будзе працягнута.

З 1 снежня гэтага года на факультэце пачата падрыхтоўка студэнтаў, якія пасля 6-гадовага абучэння будуць выкладаць геаграфію ў школах на замежных мовах.

Як бачыце, планы і задачы ў нас вялізныя. Для выканання іх прыдзецца многа папрацаваць.

**Галіна ДЗІГІЛЕВІЧ, студэнтка:**
*(здымак справа).*



*Наступаючы Новы год крышку трывожыць мяне. Першыя дні гэтага года прынясуць нам хваляванні, звязаныя з сесіяй. Але той дзень, калі мы здадзім апошні экзамен гэтай сесіі, будзе першым шчаслівым днём у 1962 годзе.*



**Т. П. ПЛЕШЧАНКА:**

У 1961 годзе ў маім жыцці адбылося шмат радасных падзей. Мае выхаванцы, былыя студэнты беларускага аддзялення, працуюць ужо ў розных кутках Беларусі. Мне было аказана вялікае давер'е — я стала дэпутатам Ленінскага райсавета.

Самай хвалюючай падзеяй было тое, што мяне прынялі ў рады нашай слаўнай Камуністычнай партыі. І яшчэ адна нямалаважная падзея. Я зараз працую загадчыкам кафедры рускай мовы на падрыхтоўчым факультэце.

Мае асноўнае жаданне на 1962 год — дабіцца таго, каб кожны студэнт-кубінец выдатна валодаў рускай мовай. Гэтае жаданне ўсяго калектыва выкладчыкаў нашай кафедры.

**С. МІЧКОЎСКІ,**
**аспірант хімфака:**

**Працую над праблемай храматаграфіі аніёнаў. Работа прынцыпіяльна новая, амаль нікім не асветленая. Гэта, у прынцыпе практычная, работа вырашана на аснове тэарэтычных поглядаў. На Адэскай канферэнцыі па храматаграфіі работа звярнула на сябе вялікую ўвагу практыкаў.**



**У новым годзе мяркую працягваць свае даследванні.**



**МІКОЛА МАЛЯЎКА, студэнт:**

*Хочацца —*
*смяяцца,*
*спяваць,*
*сустракацца з каханай.*
*Хочацца —*
*вяршыць стагі,*
*бранзавець на таку,*
*гуляць на вяселлях.*
*Хочацца жыць!..*
*Новы Год!*
*Будзь годам песень,*
*годам працы,*
*годам кахання!*

**Марыя БУРАНКОВА, студэнтка 3 курса юрфака:**

Два гады я вучылася на вячэрнім аддзяленні. У 1961 годзе я перавялася на стацыянар і знайшла тут многа харошых сяброў. Студсавет прыняў мяне ў сваю сям'ю, паклапаціўся аб тым, каб я атрымала стыпендыю. Я вельмі ўдзячна за гэта, і хачу пажадаць студсавету інтэрната № 4 у 1962 годзе яшчэ большых поспехаў.

Наш інтэрнат заняў першае месца ў вобласці. Мы, жыхары яго, вельмі ганарымся гэтым. Мне вельмі хочацца, каб наш інтэрнат у 1962 годзе заняў першае месца ў рэспубліцы.



# СТЫЛЬ НАШЫХ АДКАЗАЎ

## З СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

★ ★

**Гістфак** — адзін з лепшых факультэтаў па паспяховасці. Чым жа растлумачыць гэтыя поспехі? Працалюбівасцю. Як рыхтуюцца студэнты да семінараў? Дастаткова добра, каб адказаць. Ці ведаюць яны матэрыял? Так. І тым не менш...

У нас нярэдка справядліва гавораць аб недахопах стылістычнага, моўнага выкладання гісторыі. Навуковыя работы пішуцца занадта скупой, беднай мовай, цікавейшыя падзеі ператвараюцца ў чараду сумных фактаў. Выступленні студэнтаў на семінарах парой нагадваюць сухую статыстычную справаздачу. Навуковасць жа выкладання не адвяргае добрага стылю. Наадварот. Яны заўсёды павінны ісці побач. Ад гэтага слухач або чытач толькі выйграе.

А як жа мы адказваем на семінарах? Вось аб гэтым мне і хочацца пагаварыць. А заадно, коратка разабраць нашы выступленні з пазіцый патрабавальнасці да стылю нашых адказаў.

Ішоў апошні ў гэтым семестры семінар па Навейшай гісторыі зарубежнага Усходу. Вёў яго выкладчык Тадэуш Пятровіч Гірдзюк. Ён рабіў, калі гэта патрабавалася, дапаўненні, даваў каштоўныя заўвагі, выпраўляў памылкі. Першым узяў слова Уладзімір Клакоцкі. Яго выступленне было бурным. Яно нагадвала хутчэй пункцірную лінію, чым суцэльную прамую. Рваны стыль афарызмаў. Кожнае слова мае вагу. Ёмкія сказы змяшчаюць думкі, якія дасягаюць парой матэматычнай дакладнасці. Разам з тым Клакоцкі не баіцца выкарыстоўваць параўнанні, карыстаецца метафарамі. Таму яго мова набывае паэтычнае гучанне. Адчуваецца добрая арыентыроўка ў матэрыяле, здольнасць да глыбокага аналізу і тэарэтычных вывадаў. Задума раскрываецца поўнасцю, дзякуючы агульнай стройнасці і мэтанакіраванасці. Клакоцкі нічога не ўпускае, і тым не менш застаецца месца для думкі слухача.

Выступленне Клакоцкага смела можна назваць лепшым на гэтым семінары. Нажаль, ён не заўсёды так рыхтуецца да заняткаў. Толькі гэтым можна растлумачыць адсутнасць у яго вялікіх поспехаў на экзаменах.

Другім адказваў Кірычэнка. Яго выступленне было куды горшым. Думка не аператыўная. Яна не лятае, і нават не ходзіць, а хутчэй поўзае на чацвярэньках. Яго думка стварае такое ўражанне ляноты і апатыі, што калі яе не чапаць, то яна, бадай, нават не зварухнецца. Мова бедная, сумная, блеклая. Слухаеш яе без усялякай цікавасці. Адчуваецца, што Кірычэнка не ў ладах з добрым стылем. Напэўна, не сышліся характарамі.

Спрабаваў выступіць і я. Аднак спроба не мела поспеху. «Старт» быў добрым, але потым я адступіў убок, пачаў паўтараць адно і тое ж. Маё выступленне можна назваць няскладным. Тадэуш Пятровіч растлумачыў маю памылку. Атрымалася ў мяне нешта накшталт: мяса ёсць, а хрыбетніка няма. Гэта адбылося таму, што я слаба прадумаў план адказа.

Апошняе пытанне разбіраў Анатоль Усцілка. Гаварыў многаслоўна. Яго выступленне перагружана фактамі, лішняй дэталізацыяй, захапленнем дробязямі. Таму галоўнае засталося невыяўленым дастаткова ярка, хоць адказ быў усебаковым. У старанна закручаных сказах адчуваецца падрыхтоўка да семінара. Упэўненасцю дыхае спакойны акадэмічны тон адказу, свае словы Анатоль суправаджае ўмеранай жэстыкуляцыяй. Адказ вядзецца мовай журнальнага артыкула.

І яшчэ. Адным з недахопаў, якія сустракаюцца не толькі на нашым, але і на другіх факультэтах, з'яўляецца злоўжыванне кнігамі. Некаторыя студэнты, выступаючы на семінарах, ледзь не пальцам водзяць па радках свайго дапаможніка. У нас, на шчасце, такіх няма. Аднак карыстанне кнігамі ў пэўнай меры зніжае цану адказам. А вось у палеміцы ці спрэчцы прыходзіцца карыстацца толькі наяўнымі ведамі. Тое ж і на экзаменах. А мы ўжо на парозе сесіі, прыступаем да яе.

**Е. ЕРМІЛАЎ,**
**студэнт 4 курса гістфака.**

*Гэта хвалюе ўсіх*

# Думкі былі розныя

21 аўдыторыя біялагічнага корпуса даадказу запоўнена. Ідзе незвычайная размова. Камсамольцы і студэнты матфака гавораць аб тым, што хвалюе многіх, аб вобліку савецкага студэнта, аб закаханасці яго ў сваю справу, у выбраную спецыяльнасць, аб тых дарогах, па якіх павінен пайсці наш малады сучаснік. Ідзе дыспут па артыкулу рэктара ЛДУ А. Д. Аляксандрава «Няхай будзе больш нястрымных».

Выкладчык М. А. Лукомская падтрымала ўсе палажэнні артыкула.

— Студэнты павінны слухаць 2—3 акадамічныя гадзіны. Трэба больш даваць студэнтам займацца самастойна. Выкладчыкі ж будуць даваць кансультацыі, дапамогуць у рабоце, — заканчвае яна. Лукомскую падтрымлівае кандыдат матэматычных навук Л. К. Тутаеў.

Слова бярэ студэнтка матфака Сілкіна: «На 1—2 курсах свабоднае наведванне лекцый ўводзіць не трэба. Спачатку патрэбна прывіць ім дысцыпліну, любоў да самастойнай работы, да работы з кнігай, асабліва з матэматычнай літаратурай. Студэнты самастойна не могуць асіліць інтэгралы і фактарыялы.

Многія выступаючыя выказваюць думку аб тым, каб спецкурсы, што чытаюцца на факультэце, былі цясней звязаны з будучай работай матэматыкаў, каб тэмы работ выбіраліся больш дасканала.

Было б нядрэнна, каб былі надрукаваны масавым тыражом брашуры з лекцыямі выкладчыкаў, бо студэнт не можа законспектаваць лекцыю поўнасцю, а паспявае запісваць толькі нязначную частку яе. Таму ў галаве атрымліваецца каша.

Каб паменшыць загрузку, гавораць выступаючыя, іншыя лекцыі па некаторых прадметах трэба зусім не чытаць. Але актыўнасць і патрабавальнасць па гэтых жа прадметах на семінарскіх занятках трэба павялічыць.

Выкладчык А. С. Федэнка падверг крытыцы вучэбныя планы, якія складзены прыкладна дваццаць год таму назад. Як быццам, планы—догма. Але жыццё не стаіць на месцы. З развіццём вылічальнай тэхнікі на факультэце з'явіліся новыя дысцыпліны, метады, машыны, праграміраванне і такія прадметы, як тэорыя адноснасці, этыка, эстэтыка. А планы ўсё тыя ж. Перагляд планаў прынёс бы шмат карысці.

Частка выкладчыкаў выступіла супраць свабоднага наведвання лекцый, супраць скарачэння вучэбных планаў. Прарэктар універсітэта па навуковай частцы Г. А. Павецьеў сказаў, што студэнты павінны больш настойліва і ўпарта вучыць розныя дысцыпліны, прадметы.

Для таго, каб студэнты палюбілі працу, самастойныя заняткі, трэба прывучаць іх да гарэння ў рабоце, прывіць ім якасці сапраўднага чалавека нашага заўтра, трэба дамагацца працалюбівасці ў студэнтаў не пад пагрозай нездавальняючай адзнакі, а прывіваць ім якасці чалавека камуністычнага будучага.

Не трэба забываць, што акрамя вучобы ёсць яшчэ і спорт, і тэатр, і кіно. З універсітэта павінны выходзіць людзі шырокага кругагляду, невычарпальнага энтузіязму.

На дыспуце было заслухана шмат цікавых прапаноў адносна вучобы і здачы сесій.

Хвалюючы дыспут быў для студэнтаў стымулам у далейшай рабоце, у добрай падрыхтоўцы і здачы экзаменаў.

**Л. ДАШЧЫНСКАЯ,**
**студэнтка 4 курса матфака.**

**СПОРТ**

## ТРЫУМФ БАРЦОЎ ФІЗФАКА

Два дні спартыўная зала гуманітарнага корпуса была прадстаўлена барцам вольнага стылю. Там праходзілі спаборніцтвы барцоў універсітэта.

У спаборніцтвах прынялі ўдзел найбольш падрыхтаваныя спартсмены, у асноўным, разраднікі і тыя, хто займаецца ў секцыях. Гэта і прыдало вастрыню спартыўнай барацьбе. І хоць не ўдзельнічалі мацнейшыя барцы універсітэта Пагоцкі, Тур і іншыя, барацьба да апошняга тура была ўпартай.

Калі суддзі падлічылі вынікі, то аказалася, што ў агульным заліку перамаглі фізікі. На другім месцы спартсмены юрфака, на трэцім — хімфака.

У асабістым заліку першыя месцы ў парадку сваіх вагавых катэгорый занялі Шыпінскі, Каратаеў (фізфак), Канадо, Валевіч (юрфак), Губскі, Сальнікаў, Даценка (фізфак), Лабецкі (хімфак).

Цікавыя паядынкі правялі Губскі, Салаўёў, Шэйнеман. Нямала выявілася маладых здольных спартсменаў.

У спаборніцтвах удзельнічалі 43 чалавекі. Аднак, толькі з чатырох факультэтаў. Матэматычны, геаграфічны, біялагічны, гістарычны факультэты не выставілі ніводнага спартсмена.

**М. ШАРУБА,**
**(Наш спец. кар).**

# —Віншуем!—

## ГАВОРАЦЬ ЛЕТЧЫКІ

*Перад самым Новым годам, мне, як лётчыку-радысту, даводзіцца працаваць у эфіры. І калі б толькі хто ведаў, як разнастайны і многагалосы ў гэты час песні эфіра! З краю ў край ляцяць навагоднія тэлеграмы, віншаванні. Кожны хоча пажадаць што-небудзь добрае свайму сябру, роднаму, знаёмаму.*

*Цудоўная гэта традыцыя жадаць людзям шчасця, міру, раднай працы!*

*У мяне таксама ёсць сябра. Чатыры гады назад Аляксей Хадоркін паступаў ва універсітэт разам са мною. Ён меў багаты жыццёвы стаж, а цяпер займаецца ўжо на чацвёртым курсе універсітэта. Перад самым Новым годам мне хочацца павіншаваць праз газету свайго лепшага сябра, пажадаць яму поспехаў у рабоце і вучобе.*

*Наш калектыў змагаецца зараз за бесперабойныя выдатныя палёты. Мы паспяхова спраўляемся з усімі навагоднімі турботамі.*

*Мае сябры, лётчыкі, ведаюць, што я студэнт-завочнік БДУ. Перад самым Новым годам яны папрасілі мяне перадаць калектыву універсітэта гарачае авіятарскае прывітанне. Я з радасцю раблю гэта і гавару ад імя сваіх сяброў:*

*Віншуем з Новым годам!*

**Р. КАРАЎКІН,**
**лётчык ГПФ, бортрадыст Мінскага аэрапарта.**

**Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.**

*НАШ АДРАС:*
*Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31, тэлефон 2-07-19.*
*Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.*

АТ 15 499 Зак. 2684.